Зубчонак, Н. А.

Беларуская журналістыка ў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906—1916 гг.) : дапам. для студэнтаў Інстытута журналістыкі,

/ Н. А. Зубчонак. Мінск ; БДУ, 2010.

### 1.3.3. ПАРТЫЙНЫ ДРУК

Падзеі 1905–1907 гг. прывялі да росту колькасці перыядычных выданняў. Ён працягваўся нават у час спаду рэвалюцыі, як адзначалася вышэй. З 3310 часопісаў і газет Расіі 1467 былі грамадска-палітычнымі [66, с. 11]. Паступова перыядычныя выданні станавіліся органамі палітычных партый. Сацыяльныя пазіцыі большасці з іх дакладна вызначыць даволі складана. Некаторыя з газет да 1917 г. так і не разабраліся ў сваіх ідэйных поглядах. Тым не менш, прэса ў руках палітычных партый паступова станавілася моцным інструментам псіхалагічнага і арганізацыйнага ўздзеяння на грамадскія групы, класавую барацьбу, вызваленчы рух, сацыяльна-эканамічнае і духоўнае жыццё народа.

Першыя партыйныя выданні ў Расіі афіцыйна з’явіліся толькі пасля 17 кастрычніка 1905 г. Раней нелегальна друкавалася газета «Искра» — орган РСДРП. Нешматлікія выданні буржуазных партый таксама існавалі нелегальна.

Грамадска-палітычны друк на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю не меў магчымасці спаборнічаць з выданнямі цэнтральнай часткі Расійскай імперыі. Тут дзейнічалі ў асноўным філіялы расійскіх партый, якія спрабавалі наладзіць выданне ўласных друкаваных органаў.

Інтарэсы сацыял-дэмакратыі падзялялі такія выданні, як «Листок Северо-Западного союза РСДРП» (у верасні 1905 г. быў надрукаваны адзіны нумар газеты). Гродзенская ваенная сацыял-дэмакратычная арганізацыя ў красавіку – маі 1906 г. выпусціла два нумары газеты «Солдатская воля» і тры нумары «Минского летучего листка» (студзень 1906 г.). У 1906 г. у Гомелі было надрукавана тры нумары легальнай газеты «Труд». Неаднаразовыя спробы бальшавікоў выдаваць друкаваныя органы былі спынены паліцыяй. Бальшавіцкі друк у Беларусі меў выключна агітацыйны характар і існаваў у форме лістовак, адозваў, пракламацый.

Бальшавікамі праводзілася арганізацыйная работа па стварэнню выдавецкіх органаў. Больш за дзесяць арганізацый РСДРП, якія дзейнічалі ў Паўночна-Заходнім краі ў 1905–1907 гг., мелі свае друкарні. У буйнейшых падпольных выдавецкіх цэнтрах бальшавікоў Беларусі, напрыклад, у друкарні Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП (у Мінску), выконваліся заказы ЦК, Пецярбургскага камітэта РСДРП і

інш. Тыражы асобных лістовак, якія былі надрукаваны тут, даходзілі да 20–24 тысяч экземпляраў [2, с. 97].

Грамадска-палітычная абстаноўка ў краіне пасля разгону I Дзяржаўнай думы змянілася. Скіроўваючы свае сілы на ўдзел ў выбарах у II Дзяржаўную думу, бальшавікі арганізаваліся і ў другой палове 1906 г. распачалі агітацыю. У снежні 1906 г. члены Абласнога камітэта РСДРП Літвы і Беларусі выпусцілі тыражом 30 000 зкземпляраў лісток «Чарнасоценцы і іх памочнікі», у якім выкрывалі «ісцінна народныя» партыі «Саюз рускага народа», «Саюз 17 кастрычніка» і заклікалі выбіраць у думу «сапраўдных барацьбітоў за народную справу» — членаў РСДРП [1, 84].

Нягледзячы на параўнальна невялікі тэрмін існавання бальшавіцкіх выданняў на тэрыторыі Беларусі, яны аказалі значны ўплыў на рэвалюцыйны рух. Адным з такіх выданняў была легальная бальшавіцкая газета «Новая жизнь», якая выходзіла з 27 кастрычніка па 3 снежня 1905 г.

Легальная газета «Труд» друкавалася ў Гомелі з канца 1905 г. па люты 1906 г. (згодна з афіцыйнай справаздачай магілёўскага губернатара з 1 студзеня па 11 лютага 1906 г.), працягвала сваю работу і ў перыяд спаду рэвалюцыйнай актыўнасці. Афіцыйным рэдактарам і выдаўцом былі прызначаны рагачоўскі мешчанін А. Ю. Гінцбург і свержанскі мешчанін П. М. Каплан. Фактычнымі ж арганізатарамі і кіраўнікамі газеты былі мясцовыя сацыял-дэмакраты М. К. Уладзіміраў, Я. Б. Няхамкін і інш. Сюды ж пасля закрыцця «Северо-Западного края» перайшлі многія яго супрацоўнікі, у тым ліку Я. Окунеў, Я. Сычоў [60]. Звестак пра газету захавалася няшмат, часам яны супярэчлівыя. Напрыклад, магілёўскі губернатар у сваёй справаздачы, накіраванай у Галоўнае ўпраўленне па справах друку, назваў гомельскую газету крайне левым выданнем.

Шырока распаўсюджаны ў Беларусі былі агульнарасійскія бальшавіцкія газеты «Волна», «Вперед», «Эхо», «Пролетарий», «Казарма», «Звезда», «Правда». Выданні бальшавікоў былі, па сутнасці, прадвеснікамі іншай сістэмы друку, партыйна-савецкай, якая паспяхова на працягу амаль стагоддзя займала вядучыя пазіцыі [49, с. 108].

Дзейнасць у пачатку XX ст. розных партый адбілася на працэсе фарміравання палітычнай ідэалогіі, а менавіта — сацыял-дэмакратыі, той сістэмы поглядаў, згодна з якой адбывалася развіццё грамадскай думкі. Паводле меркавання гісторыкаў, гэта плынь у Беларусі ўзнікла ў канцы XIX – пачатку XX ст., аднак аформіцца ва ўласна беларускую палітычную тэорыю не здолела, а існавала ў формах яўрэйскай (Бунд, Паалей-Цыён і інш.), польскай (ППС, СДКПіЛ), расійскай (РСДРП) тэорый. У праграмах гэтых партый не надавалася ніякай увагі беларускім праблемам. Напрыклад, ППС ігнаравала пытанне пра беларускае нацыянальнае адраджэнне і турбавалася пра інтарэсы польскага шляхецтва на Беларусі. СДКПіЛ выступала за адзінства

дзеянняў з расійскімі сацыял-дэмакратамі і супраць стварэння сацыялістычных дзяржаў.

З утварэннем Беларускай сацыялістычнай грамады (першапачаткова — Беларускай рэвалюцыйнай грамады) беларускі шлях развіцця стаў праяўляцца больш рашуча і ясна. У гістарычных даследаваннях падкрэсліваецца, што гэта партыя была першай у XX ст. палітычнай беларускай арганізацыяй. Ю. Туронак у працы «Вацлаў Іваноўскі і адраджэнне Беларусі» сцвярджае, што яшчэ ў 1902 г. (за год да заснавання БРГ) В. Іваноўскі стварыў Беларускую рэвалюцыйную партыю (БРП), сябры якой выпусцілі першы і адзіны нумар газеты «Свабода». Менавіта гэта арганізацыя стаяла ля вытокаў беларускай сацыял-дэмакратыі, якая поўнасцю рэалізавалася ў праграмных палажэннях БСГ [67, с. 26].

У наш час гісторыкі яшчэ не вызначыліся канчаткова адносна прыналежнасці БСГ да таго ці іншага палітычнага накірунку. Меркаванняў існуе некалькі, і кожнае з іх улічвае спецыфіку палітычнай абстаноўкі ў Беларусі ў пачатку XX ст. Напрыклад, Ленін называў яе нацыянальнай леванародніцкай партыяй, марксісцкія гісторыкі 20-х г. разглядалі БСГ як блок народнікаў і марксістаў [60, с. 24]. Усё гэта дыктавалася канкрэтна-гістарычнымі абставінамі палітычнай дзейнасці ў тагачаснай Беларусі. Сапраўды, БСГ складалі людзі самых розных палітычных поглядаў. Толькі ў «Нашай ніве» працавалі сацыял-дэмакраты браты Луцкевічы, будучы бальшавік З. Жылуновіч, будучы сацыяліст-рэвалюцыянер і палітычны апанент А. Луцкевіча В. Ластоўскі. Такі неаднародны склад партыі стаў прычынай рэарганізацыі, калі ў 1915 г. з БСГ вылучылася Беларуская сацыял-дэмакратычная работніцкая група (БСДРГ), погляды якой ужо адпавядалі духу сацыял-дэмакратыі [60, с. 29].

Галоўныя палітычныя сілы Беларусі міжрэвалюцыйнага перыяду згуртаваліся вакол БСГ і яе органа – «Нашай нівы». Існуе яшчэ адно вызначэнне грамадска-палітычнай пазіцы газеты: «Наша ніва» - нацыянальна-дэмакратычная па ідэйным змесце, народная па адлюстраванні рэчаіснасці, прагрэсіўная па метадах, мэтах і спосабах палітычнага ўздзеяння»[62, с.177 ].

З 1906 г. у беларускай гісторыі пачаўся «нашаніўскі перыяд». Чамусьці многія адносяць яго толькі да гісторыі літаратуры і мастацтва. Гэта будзе не зусім правільна. «Наша ніва» была своеасаблівым штабам, вакол якога згуртаваліся не толькі літаратурна-асветніцкія, але і грамадска-палітычныя сілы. З Вільні беларускія сацыялісты распаўсюджвалі свой уплыў на розныя куткі Беларусі і Пецярбург, дзе сабралася шмат беларусаў-студэнтаў, рабочых. З «Нашай Нівай» трымалі сувязь А. Гарун і Я. Лёсік, якія адбывалі катаргу. У гэтыя гады сябрамі БСГ сталі А. Смоліч, Б. Тарашкевіч і іншыя дзеячы беларускага руху. У перыяд рэакцыі ў партыі налічвалася не менш як 2000 прыхільнікаў [56, с. 10].

Перад першай сусветнай вайной у БСГ абмяркоўваўся план далейшага разгортавання культурна-асветніцкай работы. Паводле даклада А. Луцкевіча, які захоўваецца ў бібліятэцы Літоўскай акадэміі навук, можна меркаваць, што беларускі рух за восем гадоў свайго развіцця стаў сур'ёзнай палітычнай сілай. «Думкі “Нашай долі” і “Нашай нівы”, якія распаўсюдзіліся праз восем гадоў у дзесятках тысяч экземпляраў, узгадавалі пакаленне нацыянальна свядомых беларусаў, паэтаў-песняроў, літаратараў і публіцыстаў, закранулі духавенства, між каторым узняўся беларускі рэлігійны рух, прадстаўлены ў каталікоў газетай “Bielarus” [56, с. 10]. А. Луцкевіч падкрэсліваў, што за гэты час была праведзена вялікая работа: заснаваны легальныя беларускія газеты, выдавецтвы ў Вільні і Пецярбурзе, кнігарня ў Вільні. Меркавалася наладзіць выданне часопісаў для жанчын і дзяцей («Кабецкая доля» і «Іскрачка»), планавалася заснаваць выдавецтва ў Мінску, адкрыць некалькі кнігарняў, стварыць беларускія навуковыя таварыствы, шэраг эканамічных устаноў [60, с. 32]. Развіццю гэтай стваральнай працы перашкодзіла вайна.

Спасылкі на прыведзеныя вышэй меркаванні дазваляюць нам сцвярджаць, што «Наша ніва» была тым выданнем, якое кансалідавала ўвесь беларускі рух і адлюстроўвала складаны працэс фарміравання ідэі беларускай дзяржаўнасці ў рамках тэарэтычнай платформы сацыял-дэмакратычнай, народніцкай і нацыянальнай партыі Беларускай сацыялістычнай грамады.

Сярод створаных пасля кастрычніка 1905 г. партый крайнюю правую пазіцыю займалі чарнасоценцы. У лістападзе гэтага ж года яны заснавалі свой орган «Русское знамя», а таксама арганізавалі выданні ў правінцыі. У 1906 г. у Мінску выходзіла газета «Минская речь», якую выдаваў «Аддзел апекі аб народнай цвярозасці». У праграмнай заяве газета паведамляла, што гэта грамадска-палітычнае выданне «няўхільна будзе прытрымлівацца законнасці на пачатках, абвешчаных высачайшым маніфестам 17 кастрычніка 1905 года і праграмай Саюза 17 кастрычніка» [«Минская речь», 1906, № 1]. Тут жа, у перадавым артыкуле, рэдакцыя палічыла неабходным раскрыць і ўдакладніць змест праграмнай заявы: «Дэвіз наш – трыумф парадку і законнасці... Наша задача — служыць вашым братам, якія далі сябе захапіць важакам тых ці іншых рэвалюцыйных партый... Мы будзем імкнуцца прабудзіць у іх свядомасць, што яны губяць справу свабоды» [«Минская речь», 1906, № 1].

З лістапада 1906 г. «справу» «Минской речи» працягвала газета «Минское слово» (рэдактар-выдавец Г. К. Шмід). Пазіцыя выдання праглядалася ў адным з матэрыялаў рэдактара, у якім ён спяшаўся даць ацэнку сваім уласным заслугам: «У час так званага «вызваленчага руху», калі правам стала насілле, калі чужынцы дзёрзка паднялі галовы і сталі нахабна аспрэчваць непахісныя пачаткі гаспадара краіны — рускага народа... у нас знайшоўся чалавек, які стварыў цвёрдае, прамое,

вартае рускага народа “Минское слово”. Гэта быў Г. К. Шмід» [«Минское слово», 1906, № 328].

Газета мела свой дэвіз-праграму: «Цар, Дума і народ. – Адзінства Расіі. – Расія для рускіх. – Свабода, Парадак, Праца і Уласнасць». На яе старонках не магло быць месца матэрыялам аб Беларусі. У газеце няма ніводнай публікацыі, дзе б сустракаліся назвы «беларусы» ці «Беларусь», выключэнне складалі толькі палемічныя напады на «Нашу ніву». Напрыклад, праблему нацыяналізацыі школы рэдакцыя звязвала толькі з усталяваннем у Паўночна-Заходнім краі рускіх школ. «У рускай школе яшчэ няма месца рускім настаўнікам з рускай душой...» [«Минскае слово», 1912, 25 студзеня]. Перашкаджаюць жа «нацыяналізацыі школы жыды». Вельмі ярка была выражана антысеміцкая накіраванасць газеты.

Газета выступала супраць дэмакратычных рэформ у краіне. У адным з матэрыялаў пра рэвалюцыйны рух сярод студэнтаў гучала занепакоенасць тым, што гэты рух набірае моц і прадстаўляе сабой сур’ёзную пагрозу царскаму ўраду: «За 20 з лішнім гадоў гэтага бедства нашы навучальныя ўстановы выпусцілі амаль паўмільённую армію рэвалюцыйна настроеных людзей... Гэтым, без сумненняў, тлумачацца поспехі смуты 1905–1907 гг.» [«Минское слово», 1912, 25 красавіка].

Паступова пад націскам грамадска-палітычных абставін газета крыху перагледзела свой накірунак, стала больш лаяльнай у палітычных адносінах. Адкрыты манархічны лозунг змяніўся на нейтральны падзагаловак: «Газета незалежная, палітычная, літаратурная і эканамічная». Зменшылася інфармацыя палітычнага зместу, а да рубрык, якія будаваліся на мясцовай інфармацыі, тыпу «Мясцовая хроніка», «Земскае жыццё», «Па губерні і краю», дадалася яшчэ адна – «Наш край», якая змяшчала паведамленні культурнага характару: аб канцэртах, спектаклях і інш. Аднак беларускае нацыянальнае пытанне ізноў ігнаравалася. Выданне, якое выходзіла ў цэнтры Беларусі, адмаўлялася прызнаваць яе народ, краіну, мову. Значную колькасць публікацый газеты складалі паведамленні з Беларусі. З цягам часу аб’ём расійскай інфармацыі змяншаўся.

Традыцыі «Минского слова» з 1911 па 1915 г. прадаўжала газета «Северо-Западная жизнь». Мясцовая буржуазія заснавала пры дапамозе Сталыпіна сваю арганізацыю «Белорусское общество». Сталыпінскі агент Л. Саланевіч наладзіў выпуск найбольш рэакцыйнага па тым часе выдання, якое падзяляла погляды прамысловай і сельскай буржуазіі. Прадстаўнікі правячых класаў «патрабавалі» незалежнасці ад Расіі, але такой, якая б пазбавіла яе ад канкурэнцыі расійкіх купцоў і чыноўнікаў і прадставіла б манаполію на эксплуатацыю свайго народа. У той жа час правячая вярхушка ўяўляла сабой даволі слабую палітычную сілу, каб кіраваць народам самастойна, таму моцна трымалася за расійскую ўладу, смяротна ненавідзела беларускую дэмакратычную грамадскасць,

займалася траўляй беларускіх пісьменнікаў і публіцыстаў, прыбягала да фальсіфікацыі гістарычных фактаў, адмаўляючы беларускаму народу ў праве развіваць сваю мову і культуру.

Рэакцыйна-чарнасоценная прэса з'явілася часткай агульнай сістэмы ўрадавага друку і была звязана з ім не толькі «ідэйнымі», але і цеснымі фінансавымі і адміністрацыйна-кіраўніцкімі сувязямі. У час спаду рэвалюцыі колькасць органаў рэакцыйнага друку значна павялічылася за кошт перыядычных выданняў, заснаваных чарнасоценнымі, пагромна-рэакцыйнымі арганізацыямі, якія не дапускалі нават думкі аб змяненні самадзяржаўнай формы кіравання ці аб адмене дваранска-памешчыцкіх прывілей.

У міжрэвалюцыйны перыяд урад актыўна працягваў выдзяляць сродкі на субсідзіраванне рэакцыйна-чарнасоценных выданняў. У адным са сваіх дакладаў міністр унутраных спраў М. Маклакоў адзначаў, што асобы крэдыт у памеры 910 000 рублёў быў выдзелены на падтрымку ўрадавых органаў, якія займаліся наглядам за іншародніцкім друкам і абслугоўвалі правінцыйны друк, а таксама на выданне газет і часопісаў «кансерватыўнага напрамку, якія не маглі б існаваць без урадавай падтрымкі» [34, с. 72].

У перыяд паміж дзвюма рэвалюцыямі друкаваныя выданні, зыходзячы са сваіх пазіцый, якія адпавядалі поглядам пэўных напрамкаў, раздзяліліся на некалькі плыняў: па-першае, гэта былі афіцыйныя ўрадавыя і чарнасоценныя выданні; па-другое, буржуазна-ліберальны друк, які ў сваёй дзейнасці не вызначаўся паслядоўнасцю ў поглядах і пэўнай прынцыповасцю; трэці напрамак прадстаўлялі сацыял-дэмакратычныя выданні, якія прытрымліваліся акрэсленай рэвалюцыйна-дэмакратычнай пазіцыі, аднак па прычыне абмежаванасці сваіх радоў і магчымасцей у перыяд рэакцыі не маглі доўгі час арганізаваць паўнацэнную работу.

У гэты час існаваў таксама шэраг выданняў, якія называлі сябе «свабоднымі», «беспартыйнымі». Да такіх газет на Беларусі можна аднесці «Белорусский голос» (1910 г., выйшла 10 нумароў у Гомелі); «Бобруйский курьер» (1914–1919 гг., з 1919 г. становіцца штодзённай беспартыйнай газетай); часопіс «Витебский край» (1916–1917 гг. «Еженедельный орган независимой мысли»); «Голос жизни» (1905–1906 гг., Віцебск); «Гомельская копейка» (1911–1917 гг., падзагаловак «Дешевая прогрессивная беспартийная газета»); «Гродненская копейка» (1912 г., падзагаловак «Газета вечерняя, ежедневная, беспартийная»); «Минские ежедневные ведомости» (1912 г., падзагаловак «Независимая политическая, литературная и экономическая газета»); «Свентянский листок» (1910–1914 гг., падзагаловак «Ежедневная беспартийная газета»).

Палітычны прыгнёт царызму садзейнічаў павелічэнню колькасці беспартыйных газет, рабіў магчымым існаванне выданняў, якія не мелі дастаткова вызначанай ідэйнай прыналежнасці да той ці іншай партыі.

Эканамічныя санкцыі і цэнзурная палітыка ўрада ў адносінах да прэсы стрымлівалі яе дзейнасць.

Усе так званыя «свабодныя» выданні, якія з’явіліся ў Беларусі ў міжрэвалюцыйны перыяд, можна ўмоўна падзяліць на дзве катэгорыі. Да першай адносяць газеты тыпу «Гродненской копейки», «Гомельской копейки», якія вырашылі застацца ў баку ад палітычных падзей і займацца выпускам рэкламна-камерцыйных матэрыялаў. Другі тып выданняў склалі такія газеты, як «Белорусский голос», «Минские ежедневные ведомости». Яны не мелі цвёрдай палітычнай платформы, але, тым не менш, прыхільна ставіліся да самадзяржаўнай палітыкі, заняўшы пазіцыю чакання. Некаторыя з іх адкрыта дэманстравалі негатыўныя адносіны да беларускага нацыянальнага руху. Найбольш «прагрэсіўнай» у гэтым сэнсе стала газета «Минское русское слово», (1912–1913 гг., падзагаловак «Газета независимая, политическая, литературная и экономическая».

Міжрэвалюцыйны перыяд дазволіў многім выданням вызначыцца ў сваіх пазіцыях. Значна павялічылася іх колькасць. Грамадска-палітычныя газеты і часопісы к 1917 г. уяўлялі сур’ёзную ідэалагічную сілу, здольную прыцягнуць на свой бок шматлікіх прыхільнікаў. Партыйны друк гэтага перыяду на Беларусі стаў часткай вялікай і зладжанай сістэмы прэсы.